Журнал Белорусского государственного университета. История. 2019;3:152–154
Journal of the Belarusian State University. History. 2019;3:152–154

# МЕЖДУНАРОДНАЯ НАУЧНАЯ КОНФЕРЕНЦИЯ «СОЦИАЛЬНЫЕ СТРУКТУРЫ В ВЕЛИКОМ КНЯЖЕСТВЕ ЛИТОВСКОМ: ИНДИВИДУАЛЬНОЕ И КОЛЛЕКТИВНОЕ ИЗМЕРЕНИЕ»

# МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «САЦЫЯЛЬНЫЯ СТРУКТУРЫ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ: ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ І КАЛЕКТЫЎНАЕ ВЫМЯРЭННЕ»

# INTERNATIONAL SCIENTIFIC CONFERENCE «SOCIAL STRUCTURES IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA: INDIVIDUAL AND COLLECTIVE DIMENSION»

Вывучэнне гісторыі Вялікага Княства Літоўскага як часткі беларускай нацыянальнай гісторыі пачынаецца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце з часу яго заснавання і паступовага пераезду ў Беларусь такіх знакавых даследчыкаў ва Усходняй Еўропе, як У. Пічэта і М. Доўнар-Запольскі. Сярод выпускнікоў універсітэта 1920–30-х гг. быў даследчык беларускага летапісання М. Улашчык. Аднак захапленне гісторыяй XVI–XVIII стст. у міжваенны перыяд было выклікана не столькі сістэмнымі даследаваннямі вызначанага перыяду гісторыі Беларусі, колькі наяўнасцю персанальных навуковых школ і асабістым уплывам настаўнікаў. Асобная кафедра гісторыі Беларусі была заснавана толькі ў 1958 г. І ў 1960–70-х гг. знаходзілася пад уплывам Л. Абэцэдарскага. У 1970–80-х гг. актыўна праводзіліся даследаванні сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі дасавецкага перыяду. За першыя дзесяцігоддзі інстытуцыяналізацыі беларускай гісторыі праблематыка даследаванняў была звужана да культурніцкіх і сацыяльных трансфармацый.

У навучальнай і дыдактычнай прасторы Беларусі ў 1990-я гг. адбываюцца значныя змены і структурныя пераўтварэнні. Фарміраванне і адкрытае агучванне канцэпцыі нацыянальнай гісторыі, стварэнне новых курсаў па айчыннай гісторыі, напісанне нацыянальнага гістарычнага наратыву, падрыхтоўка навуковых і педагагічных кадраў новай генерацыі запатрабавалі ад Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта заснавання структурных падраздзяленняў новага ўзроўню.

На базе рэарганізаванай кафедры гісторыі БССР у 1994 г. была створана кафедра гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Сярэднявечная гісторыя і гісторыя ранняга Новага часу пачалі выкладацца асобнымі блокамі для гісторыкаў-спецыялістаў. На пасаду загадчыка кафедры быў запрошаны выпускнік гістарычнага факультэта супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі П. А. Лойка. Новы кіраўнік кафедры і абноўлены прафесарска-выкладчыцкі калектыў змаглі закласці асновы для новага прачытання беларускай гісторыі IX–XVIII стст., падрыхтаваць спецыялістаў вышэйшай катэгорыі, якія сёння занялі свае месца ў навуковым, выкладчыцкім і кіраўнічым сегментах вышэйшай школы і навукі сучаснай Беларусі.

Напісанне падручнікаў для сярэдняй і вышэйшай школы (П. Лойка, У. Сосна, Ю. Бохан, В. Варонін, А. Любы ўваходзілі ў розныя гады ў аўтарскія калектывы), удзел у навуковых рэспубліканскіх і міжнародных даследчыцкіх праектах (пераважна з калегамі з Расіі, Польшчы і Літвы), публікацыйная і выставачная дзейнасць дазваляюць аналізаваць чвэрць веку ў гісторыі кафедры і гістарычнага факультэта БДУ як з'яву ў гістарыяграфіі Беларусі.

Уласна канферэнцыя была прысвечана грамадству Сярэднявечча і ранняга Новага часу Беларусі. Арганізатары планавалі падчас мерапрыемства разгледзець узаемадзеянні, узаемазалежнасці і ўзаемаўплывы паміж сацыяльнымі структурамі Вялікага Княства Літоўскага і індывідуальнай актыўнасцю чалавека эпохі.

У аўдыторыі імя У. Пічэты з уступным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуўся дэкан гістарычнага факультэта БДУ А. Г. Каханоўскі, які адзначыў ролю кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў у развіцці даследаванняў гісторыі Беларусі эпохі Сярэднявечча і ранняга Новага часу за апошнія два з паловай дзесяцігоддзі, распавёў пра ўласнае бачанне перспектыў кафедры, яе месца ў структурах факультэта.

Затым слова было прадстаўлена прафесару П. А. Шупляку, які ў 1991–1996 гг. займаў пасаду дэкана гістарычнага факультэта БДУ. Менавіта пры ім адбываліся карэнныя змены ў афармленні выкладання і арганізацыі беларускай гісторыі 1990-х гг. у БДУ, фарміраванне новых падыходаў да падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне айчыннай гісторыі і, у прыватнасці, вывучэнні гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ў сістэме вышэйшай і сярэдняй адукацыі, развіцці вывучэння палітычнай і рэгіянальнай гісторыі ва ўніверсітэце.

Запланаваныя пленарныя даклады былі агучаны непасрэдна супрацоўнікамі і выпускнікамі кафедры гісторыі Беларусі. У сваім выступленні загадчык Цэнтра спецыяльных гістарычных навук і антрапалогіі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прафесар кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў В. Ф. Голубеў правёў паралель паміж значэннем гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, якое надавалася ў гісторыі дзяржаўнасці ў Рэспубліцы Беларусь і Літоўскай Рэспубліцы за апошнія 30 год. Дацэнт гэтай жа кафедры У. А. Сосна акрэсліў сацыяльна-палітычныя ўмовы стварэння кафедр гісторыі Беларусі ў БДУ ў ХХ ст. і прасачыў эвалюцыю праблематыкі даследаванняў. Пра асобныя біяграфіі і статыстычныя даныя, якія адлюстроўваюць дзейнасць кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў за апошнія 25 год, распавёў дацэнт А. У. Любы. Дакладчык адзначыў асаблівасці кадравай палітыкі, якасныя паказчыкі навуковай і дыдактычнай дзейнасці прафесарска-выкладчыцкага калектыву, падрыхтоўку спецыялістаў на розных ступенях вышэйшай адукацыі. Пра перспектывы кафедры разважалі загадчык кафедры, кандыдат гістарычных навук, дацэнт У. А. Падалінскі і загадчык кафедры ў 2005–2016 гг. дацэнт Ю. Л. Казакоў.

Канферэнцыя праходзіла ва аўдыторыях будынка № 1 Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на вул. Чырвонаармейскай. У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі розных універсітэцкіх і даследчыцкіх цэнтраў Беларусі (БДУ, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Палескі дзяржаўны ўніверсітэт г. Пінска, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт і Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы), а таксама замежныя госці з Латвіі, Польшчы і Расіі.

Падчас канферэнцыі былі закрануты розныя пытанні сацыяльнай гісторыі Беларусі і Вялікага Княства Літоўскага XIV – пачатку XIX ст. Была нададзена ўвага гістарыяграфіі і крыніцам па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, сацыяльным катэгорыям грамадства Беларусі Сярэднявечча і ранняга Новага часу, царкоўным і свецкім уплывам на культуру Усходняй Еўропы.

У першы дзень – 6 чэрвеня 2019 г. – праводзіліся дзве секцыі: «Гістарыяграфія, метадалогія і наратыў Вялікага Княства Літоўскага з пункта гледжання гістарычнай навукі Беларусі XXI ст.» (мадэратары – дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ А. М. Латушкін і загадчык навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі А. М. Сцебурака) і «Палітычны народ, рэгіянальныя эліты і інстытуты ўлады Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVII стст.» (мадэратары – У. А. Падалінскі і старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі кандыдат юрыдычных навук Г. В. Дзербіна).

Сярод дакладаў, прысвечаных сярэднявечнай гісторыі Беларусі, варта адзначыць выступленні дацэнта кафедры гісторыі Расіі БДУ С. М. Цемушава «Старажытнаруская спадчына ў сацыяльнай структуры Вялікага Княства Літоўскага: традыцыі і навацыі», загадчыка аддзела гісторыі Беларусі сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, дацэнта кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ В. А. Вароніна «Постаць Вітаўта ў айчынных і замежных крыніцах XV–XVI стст. (параўнаўчы аспект)», дацэнта кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта Р. Б. Гагуа «Генрых фон Плоцке і Давыд Гарадзенскі ў супрацьстаянні Вялікага Княства Літоўскага і Тэўтонскага ордэна падчас паходу крыжакоў на Наваградак восенню 1314 г.», вядучага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. І. Дзярновіча «Штурм замка Піленай у 1336 г.: нямецкая хранікарная традыцыя, калектыўны суіцыд і раннедзяржаўныя структуры ў Жамойці XIV ст.». Праблематыка Сярэднявечча і яе папулярызацыя ў гістарыяграфіі была прааналізавана ў выступленні магістра гістарычных навук С. П. Емельянава.

Прафесар Д. У. Караў (Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы) выступіў з праблемным дакладам «Вялікае Княства Літоўскае: грамадства і дзяржава ва ўсходнеславянскіх гістарыяграфічных традыцыях навейшага часу». Пра навацыі і класіку метадалагічных падыходаў у прымяненні да тэматыкі айчыннай гістарыяграфіі распавёў дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы А. І. Еўстрацьеў.

Пра асаблівасці пошуку крыніц па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага распавялі А. М. Латушкін («Арыгіналы актаў добраахвотнага падпарадкавання ўладароў зямель Усходняй Еўропы вялікім князям літоўскім у XV ст.: архіўны лёс і сучаснае месца захоўвання») і А. М. Сцебурака («Рукапісныя крыніцы па палітычным і сацыяльна-эканамічным працэсе ў Вялікім Княстве Літоўскім у зборы навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі»). Таксама цікавасць выклікаў даклад старшага навуковага супрацоўніка аддзела нумізматыкі, археалогіі і зброі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Р. І. Крыцука «Скарб літоўскіх грыўняў з-пад в. Турэйск Шчучынскага раёна з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь» і яго адказы на пытанні прысутных.

Нельга не адзначыць выступленне студэнта гістарычнага факультэта БДУ А. А. Паршанкова з паведамленнем «Прытча пра таленты ў самапрэзентацыі ўсходнеславянскіх перапісчыкаў і друкароў кірылічных кніг».

Сярод выступленняў другой секцыі хацелася б вылучыць даклады загадчыка сектара рэдакцыйна-

выдавецкай падрыхтоўкі аддзела публікацыі дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Я. С. Глінскага «Уключэнне баяр і мяшчан у зямянскую супольнасць маёнтка Магільна Навагародскага ваяводства ў XVII–XVIII стст.», а таксама паведамленні магістра медыявістыкі С. М. Салея «Гародня ў ліпені 1567 г.: цэнтр ці перыферыя?» і старшага выкладчыка кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта В. У. Чараўко «Сацыяльны аспект пахавальнай абраднасці насельніцтва паўночнай Беларусі XIV–XVIII стст.».

У наступны дзень – 7 чэрвеня 2019 г. – адбыліся пасяджэнні яшчэ дзвюх секцый. Секцыю «Сацыяльныя структуры, стратэгіі і карпарацыі ранняга Новага часу на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага» мадэрыравала Т. У. Багдановіч, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Латвіі Латвійскага ўніверсітэта. Секцыя «Царкоўная палітыка і сацыяльныя стратэгіі на землях Вялікага Княства Літоўскага» праходзіла пад кіраўніцтвам А. У. Любага.

Сярод выступленняў другога дня мерапрыемства вылучым даклад старшага выкладчыка кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта кандыдата гістарычных навук А. У. Казакова «Міграцыя маскоўскіх служылых людзей у Вялікае Княства Літоўскае з перспектывы push-pull тэорыі», выкладчыка кафедры класічнай філалогіі філалагічнага факультэта БДУ А. У. Давыдавай «Канструяванне сімвалічнай прасторы ў дыярыушы Г. Пельгрымоўскага», магістра гістарычных навук А. А. Пруднікава «Этнасацыяльныя супольнасці ў гарадах і мястэчках каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XVII – XVIII ст.», магістранта кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ П. Л. Дзям'яна «Адаптыўныя стратэгіі насельніцтва ВКЛ у перыяд вайны 1654–1667 гг.: формы і матывацыя». Згаданыя працы раскрылі розныя аспекты эвалюцыі сацыяльнай структуры грамадства Вялікага Княства Літоўскага ў ранні Новы час.

На чацвёртай секцыі дамінавала царкоўная праблематыка, аналізаваліся дзейнасць царкоўных структур у гарадской прасторы і ўзаемаўплывы свецкай і царкоўнай культур. Так, прафесар кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы С. В. Марозава зрабіла разгорнутае паведамленне пра праблему ўзнікнення і заняпаду арганнай культуры ўніяцкай царквы на Беларусі, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацыі дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Н. В. Гарковіч выступіла з дакладам «Межы цярпення і літасці да нядбайных святароў дэкана кс. Б. Гуторскага, афіцыйнага ўніяцкага візітатара Падляскага дэканата ў другой палове XVIII ст.», дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Інстытута менеджменту, спорту і турызму П. Ю. Булаты распавёў пра месца касцёла ў гарадскім асяроддзі Ляхавічаў другой паловы XVIII ст. У працы секцыі прыняла ўдзел студэнтка гістарычнага факультэта БДУ К. М. Апончык.

Завяршыліся секцыйныя пасяджэнні дакладамі Т. У. Багдановіч «Этнічная самасвядомасць нямецкага дваранства ў кантэксце паланізацыі Княства Інфлянцкага XVII–XVIII стст.» і выпускніка кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў кандыдата гістарычных навук Д. В. Віцько «Галоўны Трыбунал ВКЛ 1699 г.».

На закрыцці мерапрыемства былі падведзены вынікі працы канферэнцыі, агучаны прапановы па ўдасканаленні працы па пошуку і апрацоўцы крыніц па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, агучаны прывітальныя лісты з віншаваннямі кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў з 25-годдзем працы па вывучэнні, выкладанні і папулярызацыі гісторыі Беларусі Сярэднявечча і ранняга Новага часу.

Асабліва хочацца адзначыць, што поруч з вядомымі спецыялістамі ў канферэнцыі ўдзельнічалі і маладыя даследчыкі – магістранты і нават студэнты гістарычнага факультэта БДУ. Іх выступленні дазваляюць спадзявацца на хуткае падрастанне кваліфікаваных даследчыкаў у галіне вклістыкі ў Беларусі.

***А. У. Любы***[1]

[1]*Андрей Владимирович Любый* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Андрэй Уладзіміравіч Любы* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Andrei U. Liuby*, PhD (history), docent; associate professor at the department of Belarus history of the ancient time and the Middle Ages, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *liuby@list.ru*